XVIII
9892 XII

Работніца і Калгасніца
Беларусі
№ 14 (159)

ДЗЯРЖАЎНАЯ БІБЛІЯТЭКА БССР

Новы закон аб сельгаспадатку ў масы

Саўгасы і калгасы ў гэтым годзе атрымліваюць новыя трактары агульнай магутнасьцю звыш мільёну конскіх сіл і сельгасмашыны для ўборкі збожжавых культур, буракоў, бавоўны, ільну на 900 міл. руб. Агульны аб'ём капітальных укладаў у сельскую гаспадарку ў гэтым годзе павялічваецца з 3.600 міл. руб. да 4.360 млн. руб.

Вялізарны новы ўздым у гэтым годзе набывае культурна-бытавое абслугоўваньне вёскі—будаўніцтва школ, больніц, клубаў,—неабходная ўмова сацыялістычнага перавыхаваньня калгаснай вёскі.

Ажыцьцяўленьне ўсіх гэтых задач патрабуе вялікіх сродкаў, патрабуе скарыстаньня ўсіх крыніц назапашваньняў у нашай краіне.

Новы закон аб сельскагаспадарчым падатку, зацьверджаны ўрадам, мае вялікае палітычнае значэньне, зьяўляецца адным з важнейшых вагароў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, служыць магутным сродкам паскарэньня тэмпаў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Сельгаспадатак нічога агульнага ня мае ні з падаткам дарэвалюцыйнай Расіі, ні з падаткам капіталістычных дзяржаў.

У іх, у капіталістаў, падатковая сыстэма зьяўляецца аднэй з магутных прылад прыгнечаньня і эксплёатацыі найшырэйшых мас працоўных.

У нас, у краіне саветаў, падатковая палітыка зьяўляецца вагаром, які дапамагае вырашэньню чарговых задач партыі і савецкай улады ў галіне індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Сельгаспадатак 1932 г. будзе ўсебакова спрыяць арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў як асноўнай задачы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, сваячасоваму выкананьню вытворчых і загатоўчых плянаў, далейшаму ўздыму жывёлагадоўлі, разьвіцьцю тэхнічных культур, якія складаюць сырцовую базу нашай лёгкай індустрыі, а таксама шырокаму разгортваньню калгаснага гандлю.

Вызначаючы разьмер абкладаньня кожнага рубля валавой даходнасьці калгасаў, закон устанаўляе прывілеі арцеляй перад таварыствамі па супольнай апрацоўцы зямлі.

Задача ўмацаваньня і далейшага разьвіцьця збожжавай гаспадаркі стымулюецца вызваленьнем ад сельскагаспадарчага падатку прыросту пасеваў па цаліне.

Асаблівае месца ў новым законе адведзена пытаньням разьвіцьця жывёлагадоўлі. Паводле гэтага закону, жывёла ўсіх відаў у калгасах не абкладаецца, вызваляецца ад абкладаньня падаткам увесь валавы даход калгасных таварных фэрм, вызваляецца ад падатку жывёла, якая знаходзіцца ў асабістым карыстаньні калгасьнікаў, ствараецца рад ільгот для разьвіцьця пасеваў траў і кармовых кораньплодаў.

Разьвіцьцю тэхнічных культур пэўна будзе садзейнічаць рад буйных ільгот. Вызваленьне ад падатку пасеваў сахарных буракоў, прыросту пасеваў пад канаплямі і ільном-даўгунцом, рад ільгот па іншых тэхнічных культурах,—усё гэта павінна ўмацаваць сырцовую базу лёгкай індустрыі.

Вялікае значэньне мае таксама поўнае вызваленьне ад абкладаньня с.-г. падаткам птушніцтва і пчалярства.

Усе паступленьні сельгаспадатку зварочваюцца ў мясцовыя сродкі па сельскіх раёнах і гарадзкіх саветах, прычым палова паступленьняў с.-г. падатку ідзе ў бюджэт сельскага савета. Новыя школы, больніцы, ясьлі, дарогі, упарадкаваньне гарадоў і вёсак—вось куды ідуць сродкі, што атрымліваюцца ад сельгаспадатку.

Як і ў мінулым годзе, калгасы будуць абкладацца ў цэлым, як арганізаваная буйная гаспадарка. Гэты прынцып абкладаньня патрабуе максымальна дакладнага вучоту і справаздачнасьці ў калгасах. Статут аб с.-г. падатку дае спэцыяльную скідку з падатку ў разьмеры 25 проц. тым калгасам, якія выканаюць сваячасова пляны загатовак і паставяць узорна справаздачнасьць (гэта адлічэньне павінна цалкам пайсьці на прэміяваньне калгасных брыгад і асобных ударнікаў, якія забясьпечылі выкананьне вытворчых і загатоўчых плянаў).

Мясцовым органам у бягучым годзе даецца права зьніжаць стаўкі падатку маламоцным і неўмацаваным калгасам. Апрача таго, захоўваецца прынцып мінулага году—поўнае вызваленьне ад падатку маламоцных калгасаў.

Сыстэма абкладаньня аднаасобнікаў сераднякоў у асноўным захоўваецца леташняя.

Пастановамі падатковых камісій поўнасьцю ці часткова вызваляецца ад сельгаспадатку бядняцкая частка аднаасобнікаў. „Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на вызваленьне маламоцных гаспадарак былых чырвонагвардзейцаў і чырвоных партызан".

Кулацкія гаспадаркі ў бягучым годзе, як і ў мінулым, абкладаюцца сельгаспадаткам па іх сапраўднай даходнасьці ў індывідуальным парадку.

Растлумачваючы клясавую сутнасьць новага закону, праводзячы цьвёрдую і няўхільную палітыку падатковага абкладаньня кулацтва, растлумачваючы вялізарнае значэньне новага с.-г. падатку, як аднаго з важнейшых прылад палітыкі партыі на вёсцы, неабходна змагацца супроць праваапартуністычных спроб выпустошыць палітычны зьмест і змазаць палітычную сутнасьць новага закону, спроб зьвесьці яго да сумы звычайных фінансавых мерапрыемстваў. Новы закон аб сельгаспадатку—важнейшы ланцуг у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

(З перадавой „Правды" ад 7-V 1932 г.).

На вокладцы: т. Эпштэйн—лепшая ўдарніца мякка-шакаладнага цэху ф-кі „Камунарка", г. Менск. Фото т. Ге.

XVIII

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

9892

Работніца і Калгасьніца Беларусі

МАЙ 1932 год — 8-мы год выданьня — № 14 (159)

Старшыні ЦВК СССР—Пятроўскі, Калінін, Мусабекаў і Чарвякоў.

Асноўныя ўстаноўкі для складаньня другога пяцігадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры БССР

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР і Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

(Канец).

V.

На транспарце. Правесьці карэнную рэканструкцыю ўсіх відаў транспарту і асабліва воднага (рэканструкцыя сыстэм рэк Дняпра, Бярэзіны, Прыпяці, Заходняй Дзьвіны) і дарожнага (бязрэйкавага) транспарту. Запраэктаваць мерапрыемствы, якія забясьпечваюць максымальную прапускную здольнасьць транспартнай сыстэмы БССР, зьвярнуўшы належную ўвагу на авія- і аўтатранспарт.

VI.

У галіне паляпшэньня матар'яльна-бытавога абслугоўваньня працоўных, камунальнай і жыльлёвай гаспадаркі. У другой пяцігодцы павінна быць забясьпечана рэзкае паляпшэньне матар'яльна-бытавога дабрабыту працоўных мас. Узровень забесьпячэньня насельніцтва асноўнымі спажывецкімі таварамі, у тым ліку і харчамі, павінен быць павялічан да канца другой пацігодкі ў 2—3 разы ў параўнаньні з канцом першай пяцігодкі.

Абавязковай умовай паляпшэньня матар'яльна-бытавога дабрабыту працоўных зьяўляецца разгортваньне лёгкай (швэйнай, гарбарна-абутковай і харчовай) прамысловасьці, выкананьне і перавыкананьне імі вытворчых плянаў і падвышэньне якасьці прадукцыі.

У галіне камунальна-жыльлёвай гаспадаркі трэба забясьпечыць такі рост камунальнага і жыльлёвага будаўніцтва, які-б пераганяў рост рабочага насельніцтва і ствараў-бы ўмовы для няўхільнага паляпшэньня жыльлёва-бытавога становішча працоўных. Выходзячы з гэтага, намеціць:

а) давядзеньне ў 1937 годзе нормы жылой плошчы ў гарадох і рабочых пасёлках да 7 кв. мэтраў на чалавека і для рабочых сельска-гаспадарчага сэктару—да 6 кв. мэтраў;

б) арганізацыю правільнага водаснабжэньня ва ўсіх паселішчах (будаўніцтва водаправодаў ва ўсіх буйных гарадох);

в) арганізацыю рэгулярнай ачысткі ў гарадох і будаўніцтва каналізацыі ў буйнейшых прамысловых цэнтрах (Гомель, Віцебск, Магілёў, Бабруйск);

г) разгортваньне будаўніцтва лазьняў і пральняў, давёўшы да 24-х памывак у год на чалавека;

д) разьвіцьцё гарадзкога аўтатранспарту, пашырэньне менскага трамваю, рэканструкцыю віцебскага і будаваньне трамваю ў Гомелі;

е) разгорнутае будаўніцтва па гарадзкім дабрабыце (брукаваньне, абзеляненьне і інш.);

ж) разгортваньне мерапрыемстваў у галіне аховы і аздараўленьня ўмоў працы, асабліва прафілактычнага характару, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на забесьпячэньне насельніцтва БССР усімі відамі стацыянарнай і перасоўнымі формамі лекавай дапамогі і правядзеньне мерапрыемстваў па рашучым выкараненьні эпідэмічных захворваньняў;

з) поўны ахоп сеткай дзіцячых і дашкольных устаноў усіх дзяцей дашкольнага ўзросту, максымальнае разьвіцьцё ўстаноў аховы мацеры і дзіцяці.

Вялікае значэньне ў справе павышэньня тэмпаў уздыму ўсёй народнай гаспадаркі, выяўленьня рэзэрваў росту сацыялістычнага накапленьня і, як вынік гэтага—лепшага задаваленьня запатрабаваньняў працоўных мас—мае разгортваньне савецкага гандлю і ў першую чаргу раздробнага. Трэба ўсямерна пашыраць і тэхнічна рэканструяваць усю гандлёвую сетку. Толькі на аснове разгорнутага таваразвароту „магчыма падрыхтаваць адмену нармаваньня водпуску тавараў і замяніць сыстэму цэнтралізаванага разьмеркаваньня разгорнутым савецкім гандлем".

VII.

У галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва забясьпечыць рэзкае павышэньне культурнага ўзроўню ўсяго насельніцтва і шырокае культурнае абслугоўваньне ўсіх нацыянальнасьцяй рэспублікі на роднай мове:

а) забясьпечыць увядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня для ўсіх дзяцей і поўную

Державна публічна бібліотека ОДЕСА 21 22
Бібліятэка БССР імені Леніна

палітэхнізацыю школы. У агульна-асьветнай палітэхнічнай школе забясьпечыць паступовае падаўжэньне тэрмінаў навучаньня да 17 год, у першую чаргу на важнейшых вучастках народнай гаспадаркі, улічваючы пры гэтым патрэбу падрыхтоўкі кадраў. Прадугледзіць значнае разгортваньне па-зашкольнай работы з дзяцьмі ў цеснай сувязі з усёй работай школы;

б) прадугледзіць мерапрыемствы для павышэньня агульна-асьветнага і палітэхнічнага ўзроўню дарослага насельніцтва ня менш як у аб'ёме пачатковай школы для ўсіх працоўных, а для паасобных кадраў пралетарыяту ў аб'ёме сямігодкі;

в) выходзячы з задач тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі і аўладаньня тэхнікай, прадугледзіць у другім пяцігодзьдзі поўны ахоп усіх працоўных усеагульным тэхнічным навучаньнем і разгортваньне падрыхтоўкі тэхнічных і масавых кадраў з тым, каб на працягу другой пяцігодкі задаволіць уласнымі кадрамі (у тым ліку з нацыянальных меншасьцяй) гаспадарчае і культурнае будаўніцтва БССР;

г) разгарнуць сетку навукова-дасьледчых устаноў для поўнага абслугоўваньня ў першую чаргу вядучых галін народнай гаспадаркі і стварыць сыстэму нізавых навукова-дасьледчых арганізацый (лябараторый на прадпрыемствах і інш.). Асаблівы ўпор павінен быць зроблен на якасьць работы навукова-дасьледчых устаноў;

д) у другім пяцігодзьдзі павінна быць створана магутная матар'яльна-тэхнічная база культурнай рэвалюцыі: друк і паліграфічная прамысловасьць, забесьпячэньне газэтай і кнігай на роднай мове ўсіх нацыянальнасьцяй БССР, будаўніцтва школ, вышэйшых навуковых і навучальных устаноў, тэатраў, бібліятэк, клюбаў палітэхнічнага абсталяваньня для школ, радыёфікацыя і кінофікацыя.

VIII.

Вытворчая спэцыялізацыя БССР у народна-гаспадарчым комплексе Саюзу ССР патрабуе рацыянальнага геаграфічнага разьмяшчэньня сацыялістычных працоўных сіл і на гэтай аснове эканамічнага раёнаваньня рэспублікі. Асаблівая ўвага пры гэтым павінна быць зьвернута на пэрспэктывы разьвіцьця існуючых прамысловых цэнтраў і гарадоў (асабліва Менску), і новых прамысловых цэнтраў (Крычаў і інш.), а таксама на праблему разьмяшчэньня буйных цэнтраў сельска-гаспадарчай вытворчасьці (саўгасы, МТС і г. д.),

IX.

Савет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б падкрэсьліваюць, што рашучае павышэньне якасных паказальнікаў работы, упартая барацьба за павышэньне прадукцыйнасьці працы, за кожны процант зьніжэньня сабекошту, за паскарэньне і патаненьне будаўніцтва, за паляпшэньне якасьці прадукцыі, за мабілізацыю і максымальнае скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў кожнага прамысловага прадпрыемства, саўгасу, калгасу, за эканомію сырцу, апалу, за ліквідацыю браку і страт у вытворчасьці, лепшае скарыстаньне рабочай сілы, шырокае разгортваньне радыё-арганізатарскай работы—зьяўляюцца абавязковай умовай выкананьня сусьветна-гістарычных задач другой пяцігодкі.

X.

Ажыцьцяўленьне вялізарных сусьветна-гістарычных задач другой пяцігодкі рабочая кляса забясьпечыць толькі на аснове цьвёрдага і няўхільнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, толькі ў самай рашучай і непрымірымай барацьбе з рэштkамі капіталізму, „даючы бязьлітасны адпор супраціўленьню гінучых капіталістычных элемэнтаў, перамагаючы буржуазныя і дробна-буржуазныя забабоны сярод працоўных і вядучы настойлівую работу па сацыялістычным іх перавыхаваньні".

„Гэта азначае, што і ў далейшым яшчэ нямінуча абвастрэньне клясавай барацьбы ў асобныя моманты і асабліва ў асобных раёнах і на асобных вучастках сацыялістычнай будоўлі, што разам з тым падкрэсьлівае нямінучасьць захаваньня, а ў некаторых выпадках і ўзмацненьня буржуазных уплываў на паасобныя пласты і групы працоўных, нямінучасьць яшчэ на працягу доўгага часу прасяканьня варожых пралетарыяту клясавых уплываў у асяродзішча рабочых і нават у партыю.

У сувязі з гэтым перад партыяй стаіць задача ўзмацненьня пралетарскай дыктатуры і далейшага разгортваньня барацьбы з апартунізмам і асабліва з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе".

КП(б)Б, рабочая кляса, савецкія і прафсаюзныя арганізацыі павінны выходзіць з тых акалічнасьцяй, што ва ўмовах БССР задача ўзмацненьня клясавай пільнасьці на ўсіх вучастках сацыялістычнай будоўлі, задача рашучай барацьбы з рэштkамі варожых клясаў і з іх уплывамі на паасобныя праслойкі працоўных зьяўляецца аднэй з галоўных палітычных задач.

Савет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б цьвёрда ўпэўнены, што на аснове максымальнага росту творчай актыўнасьці, ініцыятывы шырокіх працоўных мас, далейшага ўзьдыму сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, далейшага разгортваньня пралетарскай самакрытыкі, рашучай барацьбы з бюрократызмам, рашучага паляпшэньня якасьці работы ўсіх зьвеньняў савецкага, гаспадарчага, каапэрацыйнага апарату, узмацненьня сапраўды канкрэтнага гаспадарчага кіраваньня, цьвёрдага і няўхільнага правядзеньня 6 указаньняў тав. Сталіна, як цэльнай адзінай сыстэмы мерапрыемстваў—рабочая кляса, калгасныя, бядняцка-серадняцкія масы і ўсе працоўныя БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, ня толькі выканаюць, але і перавыканаюць заданьне другой пяцігодкі—пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Старшыня Савету Народных
Камісараў М. Галадзед.

Сакратар ЦК КП(б)Б М. Гікало.

З кожным днём мацнее наша тэхнічная, эканамічная і палітычная база, і СССР ператвараецца ва ўсё больш магутную цытадэль сацыялізму.

(З дакладу тав. Молатава на XVII партканфэрэнцыі аб другой пяцігодцы).

Рабочыя і работніцы Бярэзінскага камбінату ў барацьбе за прамфінплян

Бярэзінскі камбінат (гор. Барысаў) пачаў выходзіць з паласы прарыву, які ён меў у 1931 г. Прычына посьпехаў—сапраўдная мабілізацыя мас рабочых і работніц на выкананьне 6-ці гістарычных умоў тав. Сталіна.

Вось арытмэтыка сацыялістычных тэмпаў. „Пралетарская перамога" выканала прамфінплян за першы квартал 1932 году на 101,1 проц., што дае ўзрост супроць чацьвертага кварталу мінулага году на 37,6 проц.

Вылучэнка Патаповіч працуе загадчыкам здымальнага цэху (Бярэзінскі камбінат).

За сакавік месяц плян па запалках выканан на 108 проц., па фанэрным заводзе — на 102,1 проц.

За апошні квартал арганізавана 25 гаспадарча-разрахунковых брыгад, якія ахапляюць 406 чалавек работніц і рабочых. За кароткі тэрмін работы гаспадарча - разрахунковыя брыгады аўтаматычнага цэху далі 1.400 р. эканомii, фанэрнага—600 руб.

Камбінат налічвае 85 ударных брыгад, у якіх працуе 1.166 чалавек. На чале 49 брыгад стаяць работніцы. Брыгады гераічна змагаюцца за выкананьне прамфінпляну. Першая жаночая ўдарная брыгада фанэрнага цэху выканала прамфінплян за першы квартал на 104 проц. Другая брыгада Лібэрман—на 107 проц., ні аднаго прагулу ня было ў брыгадзе за першы квартал.

З выкананьнем колькасных паказальнікаў рабочыя і работніцы Бярэзінскага камбінату пад кіраўніцтвам партыйнага калектыву справіліся, але якасныя паказальнікі ганебна застаюцца ў паласе прарыву. Першы квартал даў браку звыш плянавых намячэньняў на 13 проц. Слаба праводзілася на камбінаце праца па барацьбе з бракам, за добраякасную прадукцыю. Бываюць значныя прастоі машын, з прычыны іх дрэннага рамонту і нядбайных адносін да машын з боку рабочых. Слаба мабілізавана маса рабочых і работніц на барацьбу з прагуламі. Колькасьць прагулаў на працягу ўсяго першага кварталу і ў красавіку месяцы застаецца стабільнай.

Культмасавая работа зусім адсутнічае на камбінаце. Партыйныя пастановы аб дыфэрэнцыяваньні масавай працы сярод работніц не ажыцьцяўляюцца, ня гледзячы на тое, што работніцы складаюць 75 проц. агульнага ліку рабочых. Дэлегацкіх сходаў няма, партарганізацыя тлумачыць гэта тым, што дэлегацкія сходы ўносяць паралелізм у працу, бо асноўная маса рабочых на камбінаце работніцы і ў выніку масавая праца адсутнічае.

Магчымасьці для ўцягненьня работніц у грамадзкую працу і вучобу ёсьць. Пры камбінаце ёсьць добра абсталяваныя ясьлі, якія працуюць у тры зьмены, што поўнасьцю вызваляе матку-работніцу ад клопатаў за дзецьмі.

Перадом, які зараз ёсьць на камбінаце, трэба ня толькі замацаваць, але і надалей разгортваць у асноўным па лініі барацьбы за якасьць прадукцыі.

Шляхам разгортваньня масавай работы вакол сапраўднага ажыцьцяўленьня 6-ці ўмоў т. Сталіна трэба мабілізаваць рабочых і работніц на барацьбу з бракам. У далейшым, даючы перавыкананьне колькасных паказальнікаў прамфінпляну, ня трэба забываць аб якасьці.

Старшыня фабкому Бярэзінскага камбінату т. Гайдук

Т.

Цаперава—лепшая ўдарніца ф-кі Бярэзіна (г. Барысаў), прэміявана на зьлёце ўдарнікаў

Арганізацыяй новых гаспадарча-разрахунковых брыгад, высоўваньнем штодзенных сустрэчных брыгадных плянаў, забясьпечым выкананьне плянаў 4-га заключнага году пяцігодкі

ПРАВАКАТАРЫ ЗА „РАБОТАЙ“

Ужо звыш паўгода грамадзкая думка працоўных усяго сьвету прыкована да Далёкага Усходу, да крывавых падзей, якія там разгортваюцца. Дымяцца разваліны спаленых і разбураных японскімі акупантамі кітайскіх гарадоў і сёл, валяюцца яшчэ непахаванымі трупы забітых і замучаных японскай ваеншчынай мірнага кітайскага насельніцтва — мужчын, жанчын і дзяцей, сотні-ж тысяч пазбавіліся ўсёй маемасьці і літаральна галадаюць. Вайна, пачатая японскім імпэрыялізмам у Кітаі, ня спыняецца. Апэтыты акупантаў растуць. У Манчжурыю бязупынна прыбываюць усё новыя дывызіі, там канцэнтруецца новая вялізарная армія для нападу на Савецкі Саюз.



Руіны пасьля ваздушнай бамбандзіроўкі з боку японцаў.

Японскія імпэрыялісты, затапіўшы ўсю Манчжурыю, унутраную Манголію, Шанхай, добра ўяўляюць сабе тое, што іншыя імпэрыялістычныя дзяржавы, напрыклад, Англія, Амэрыка, якія ўклалі вялізарныя капіталы ў Кітай і самі прэтэндуюць на львіную долю кітайскай тэрыторыі, з боязьню пазіраюць на празьмернае ўзмацненьне японскага імпэрыялізму ў Кітаі.

Каб нэйтралізаваць сваіх імпэрыялістычных канкурэнтаў, японская ваеншчына дэманструе сваю гатоўнасьць справакаваць вайну з СССР, разьлічваючы такім чынам набыць сабе спачуваньне з боку найбольш варожых да Савецкага Саюзу капіталістычных груп Эўропы і Амэрыкі.

З другога боку шпарка расьце партызанскі рух у акупаванай Манчжурыі, з кожным днём гэты рух захапляе сабою ўсё больш шырокія пласты ўзруйнаваных кітайскіх сялян і ўцягвае іх ва ўзброеную барацьбу супроць японскіх акупантаў, падымаючы працоўныя масы ў Шанхаі і ва ўсім цэнтральным Кітаі. Адначасова расьце ўплыў кітайскай кампартыі і яе Чырвонай арміі. Усё гэта штурхае страціўшы галаву агалцелы японскі імпэрыялізм да пашырэньня канфлікту, да падрыхтоўкі ўзброенага нападу на Савецкі Саюз.

Для дасягненьня гэтай мэты японскі імпэрыялізм ня спыняецца ні перад чым. Няма таго дня, каб тэлеграф ня прыносіў нам новых фактаў антысавецкай правакацыі на КУЧ. Інсцэніруюцца замахі на чыгуначныя масты, дарогі і цягнікі. У палове красавіка белагвардзейская зграя пад дырыжэрствам японскай ваеншчыны напала на памяшканьне праўленьня КУЧ, уварвалася ў габінэт савецкага намесьніка — кіраўніка дарогі тав. Кузьняцова, разграміла службовы габінэт, — адным словам, зрабіла разбойніцкі налёт пры прыхільным падтрыманьні харбінскай улады.

Больш таго. Дарадца кітайскай паліцыі ў Харбіне—японец Ягі атрымлівае ад японскай ваеннай камісіі даручэньне арганізаваць вобыск у савецкім генэральным консульстве ў Харбіне. Адначасова адбываюцца масавыя арышты ні ў чым не вінаватых савецкіх грамадзян, страшэннае іх катаваньне і зьдзекі. Арышты праводзяцца галоўным чынам японскай жандармэрыяй і паліцыяй. Зараз намі атрыманы весткі аб тым, што звыш 100 арыштаваных савецкіх грамадзян, якія заключаны ў падвале японскага консульства ў Харбіне, у знак пратэсту супроць „цывілізаваных“ мэтадаў расправы, якія ўжываюцца „дарадцам“ харбінскай паліцыі японцам Ягі і яго белагвардзейскімі дапаможнікамі,—абвясьцілі галадоўку.

З прычыны масавых арыштаў савецкіх грамадзян у паўночнай Манчжурыі, генэральны консул у Харбіне т. Славуцкі зьвярнуўся да Харбінскага дып. камісара з пратэстам.

Уся гэта правакацыйная работа японскай ваеншчыны і яе дапаможнікаў белагвардзейскай зграі суправаждаецца адначасова шырокай антысавецкай кампаніяй японскай і белагвардзейскай прэсы. Выдумваюцца і пашыраюцца рознага роду бязглузьдзіцы накшталт „дапамогі“ Савецкага Саюзу славутаму генэралу Ма-дзін-Чжоу і Лі-ду, адным словам усім тым, чые імёны правакатары лічаць для сябе мэтазгодным зьвязваць з імем Савецкага Саюзу.

Савецкі Саюз з самага пачатку канфлікту на Далёкім Усходзе цьвёрда і пасьлядоўна праводзіць палітыку самага строгага нэйтралітэту і няўмешваньня. Нават ворагі Савецкага Саюзу ў розных краінах прызнаюць гэты абсалютна відавочны факт, што пазыцыя СССР вызначаецца няўхільным імкненьнем да захаваньня міру і перашкоды ўсялякім спробам пашырэньня канфлікту і ўцягненьня ў яго Савецкі Саюз. Тым ня менш на працягу мінулых 7-мі месяцаў мы маем справу з ланцугом самых разнародных і агідных правакацый, якія ўвесь час ня толькі ня спыняліся, але набываюць усё больш наглы характар.

Апошні разбойніцкі налёт белагвардзейшчыны на праўленьне КУЧ, зроблены па загаду японскай ваеншчыны, сьведчыць аб тым, што японская вайсковая зграя для дасягненьня сваіх мэт—справакаваньня на вайну СССР—пачынае дзейнічаць напралом.

„Посьпехі“ японскіх акупантаў на Далёкім Усходзе не даюць спакою польскаму фашызму, распальваюць яго захватніцкія апэтыты, узмацняюць яго акупанцкія імкненьні.

Маршала Пілсудзкага ўжо не здавальняюць толькі прыёмы розных генштабістаў „саюзных дзяржаў“. Ён асабіста едзе ў Румынію раіцца з румынскай ваеншчынай і французскімі апякунамі з генштабу, едзе ў Бэсарабію на савецкую мяжу для папярэдняй рэкагнасцыроўкі інтэрвэнцыі. Сацыял-фашысцкая прэса са свайго боку вядзе

Імпэрыялісты Японіі, Эўропы і Амэрыкі прыгнечваюць Кітай, праводзяць яго падзел. Далоў інтэрвэнцыю супроць Кітаю. Няхай жывуць Саветы ў Кітаі, арганізатары свабоды і незалежнасьці кітайскага народу.

энэргічную кампанію па падрыхтоўцы і апрацоўцы грамадзкай думкі да новай інтэрвэнцыі супроць СССР. Старонкі польскай буржуазнай прэсы перапоўнены штодня патокамі брудных паклёпаў на СССР. Усе гэтыя высмактаныя з пальца весткі, розная бязглузьдзіца пра СССР маюць на мэце пераканаць чытача аб „савецкім барбарстве", аб „Чырвоным імпэрыялізьме" і г. д. Фашысцкая і асабліва сацыял-фашысцкая прэса ў сваёй антысавецкай кампаніі напружвае ўсе сілы, каб толькі пераканаць, унушыць масам, што іменна Савецкі Саюз прагне вайны.

Асабліва актыўную ролю па ашукваньні працоўных мас, па ўсыпленьні іх пільнасьці да новай сусьветнай бойні, у першую чаргу ўзброенага нападу на СССР адыгрывае II Інтэрнацыянал, у прыватнасьці, польскія сацыял-фашысты. Усе самыя агіднейшыя антысавецкія правакацыі японскага імпэрыялізму і белых банд знаходзяць сярод польскіх сацыял-фашыстаў самых гарачых абаронцаў. Правакацыйныя напады белагвардзейскіх банд на дырэкцыю КУЧ паводле ЦО польскага сацыял-фашызму „Работніка" (ад 23-га красавіка) толькі „дэманстрацыя групы рабочых".

Імпэрыялістычныя драпежнікі і іх сацыял-фашысцкія агенты прабуюць адцягнуць увагу працоўных мас ад узрастаючай пагрозы вайны і плянаў разбойніцкага нападу на Савецкі Саюз. Яны ў сваёй прэсе стараюцца ўтаіць перад працоўнымі масамі ліхаманкавую падрыхтоўку імпэрыялістамі новай вайны. Яны замоўчваюць той факт, што ваенныя заводы Эўропы працуюць з павышанай нагрузкай. Яны ня толькі замоўчваюць, але нават прасьледуюць тых рабкораў-рэвалюцыянэраў, якія ў сваіх карэспандэнцыях выкрываюць гэту падрыхтоўку імпэрыялістаў да вайны.

Узмоцненым тэмпам у буйных партох—Гамбургу, Ротэрдаме, Антвэрпэне, Марсэлі, Дзюнкірхэне, Лёндане — сотні суднаў нагружаюцца выбуховымі

Зьверху ўніз: 1. Японскія салдаты вядуць арыштаваных кітайцаў. 2. Кітайскія грамадзкія арганізацыі развозяць харчы салдатам 19 арміі, 3. Японская конная паліцыя разганяе дэманстрантаў, 4. Разгон дэманстрацыі сьлезацечывымі газамі.

Адкажам на пагрозу вайны і інтэрвэнцыі ўзмацненьнем бальшавіцкіх тэмпаў будаўніцтва сацыялізму, ператворым кожны завод, саўгас, калгас у несакрушальную крэпасьць абароны краіны

матэрыямі і атрутнымі газамі для японскага імпэрыялізму, супроць Кітаю і Савецкага Саюзу. Жандар Эўропы—французскі імпэрыялізм—фінансуе і арганізуе на Захадзе фронт супроць Савецкага Саюзу. У той час, як у Жэнэве на канфэрэнцыі Лігі нацый прадстаўнікі буржуазных урадаў займаюцца балбатнёй аб міры і раззбраеньні, у іх краінах ліхаманкава расьце ваенны бюджэт, а ваенная прамысловасьць працуе з нябывалай нагрузкай.

Небясьпека новай імпэрыялістычнай сусьветнай бойні за перадзел сьвету ніколі ня была так сур'ёзна і так рэальна, як зараз. Грандыёзныя посьпехі пяцігодкі паказалі, што спаборніцтва паміж капіталістычнай і сацыялістычнай сыстэмамі вырашана на карысьць краіны пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, на карысьць сацыялізму. Гэты гістарычны факт пабуджае сусьветны імпэрыялізм, пахіснуты ў сваіх асновах абвастрэньнем клясавай барацьбы, ростам рэвалюцыйнага руху, нацыянальна-вызваленчай барацьбой у калёніях і ўзрастаючым абвастрэньнем імпэрыялістычных супярэчнасьцяй, — шукаць выхаду з крызісу ў вайне, і ў першую чаргу ў інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу.

Сацыял-фашысцкі II Інтэрнацыянал актыўна дапамагае імпэрыялістам распальваць новую сусьветную бойню.

Выступаючы на словах супроць вайны, яны на справе ўсімі сродкамі гвалту і тэрору прабуюць задушыць рэвалюцыйную барацьбу супроць вайны. Сацыял-фашысты з нячуваным цынізмам прапануюць свае паслугі ў якасьці арганізатараў штрэйкбрэхэрства. Яны прабуюць пераканаць рабочых, што вайна дае ім хлеб і работу, шляхам ілжывых пацыфісцкіх манэўраў сацыял-фашысты прабуюць ашукаць рабочую клясу, тоячы ад яе ўзрастаючую пагрозу вайны і інтэрвэнцыі. Сацыял-фашысты і іх міністры бяруць на сябе ахову транспартаў з ваенным грузам для японскага імпэрыялізму. Усе партыі сацыял-інтэрвэнцыя нацыяналу актыўна падтрымліваюць ваенную палітыку сваіх імпэрыялістычных урадаў.

Гэтаму чорнаму фронту контр-рэвалюцыі процістаіць рэвалюцыйны клясавы фронт пралетарыяту, які пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі вядзе барацьбу не на жыцьцё, а на сьмерць, супроць капіталу, за зьвяржэньне ўлады наскрозь прагнілага капіталізму, за рэвалюцыйны выхад з крызісу. „Тыдні барацьбы супроць вайны", якія былі праведзены ва ўсіх капіталістычных краінах пад знакам найшырэйшай мабілізацыі мас на барацьбу супроць вайны, у абарону Савецкага Саюзу, нарэшце, першамайскія дэманстрацыі сьведчаць, што пралетарыят, пад кіраўніцтвам брацкай кампартыі, у выпадку ўзброенага нападу на Савецкі Саюз ператворыць вайну імпэрыялістычную ў вайну грамадзянскую.

С. Ж.



1. Парад Чырвонай арміі ў Маскве, калона бранявікоў. 2. Асоавіахімаўка ў дэгазацыйным адзеньні вызначае напрамак ветру.

„Ні аднэй пядзі чужой зямлі ня хочам, але і сваёй зямлі ні аднаго вяршка не аддамо нікому"
(СТАЛІН).

ГЭРОІ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ТЭМПАЎ

Да трэцяй гадавіны сацспаборніцтва фабрыка „Кастрычнік" (Менск) падыйшла са значнымі дасягненьнямі 6 умоў т. Сталіна рабочыя і работніцы сапраўды праводзяць у жыцьцё. Ёсьць 38 гаспадарча - разрахунковых брыгад, якія зьяўляюцца перадавікамі бальшавіцкіх тэмпаў. Вось лепшыя з іх.

Прыклад у працы паказвае гаспадарча - разрахунковая брыгада імя МОПР'у (3-ці агрэгат, 1-я зьмена). Апэрацыйная праца брыгады, на аснове штодзеннага правядзеньня зьменна-сустрэчных плянаў, дала выкананьне прамфінпляну за сакавік 111,5 проц. Старшы брыгадзір тав. Крэўскі кожны дзень правярае выхад на працу, сваячасовае зьяўленьне рабочых. На розныя ненармальнасьці сход брыгады зараз-жа рэагуе.

Брыгада па-бальшавіцку змагаецца за якасьць прадукцыі. Калі тав. Меднік рабіла прадукцыю дрэннай якасьці, то агульны сход брыгады зараз-жа гэта асудзіў.

Прозьвішчы рабочых, якія не наведваюць сходаў, вытворчых нарад, зьмяшчаюцца штодзенкай на спэцыяльных плякатах. Такімі сродкамі грамадзкай узьдзейнасьці брыгада дабілася раду посьпехаў у сэнсе эканоміі сыр цу і фарнітуры. Раней падкладка для кішэняў, кромка валяліся на падлозе, потым выкідваліся ў сьмецьце, што давала шмат страт. Зараз гэта зьнішчана. Ёсьць спэцыяльныя скрынкі для хаваньня ножніц, іголак, крэйды і інш.

Лепшыя ўдарнікі брыгады т. т. Грандэ, Левіна, Азэйман, паказваюць узоры бальшавіцкай работы. Брыгада прэміявана на ўсебеларускай канфэрэнцыі ўдарнікаў якасьці.

У часе падрыхтоўкі да дня друку нарадзілася новая гаспадарча - разрахунковая брыгада імя „Правды" пад кіраўніцтвам лепшага ўдарніка тав. Лысенкі.

Раней было цяжкавата, некаторыя не згаджаліся з нормай пераробкі 0,2 проц., былі непаладкі. Але дзякуючы ўпартай працы брыгадзіра тав. Лысенкі, кантралёра Лібецкай і штодзёнкі, якія па-бальшавіцку штурмавалі безгаспадарчасьць, выкрывалі і ганьбілі ілжэ-ўдарнікаў, брыгада дабілася значных посьпехаў. За сакавік прамфінплян выканан на 110 проц. Ударнікі брыгады кажуць, што дапушчаныя па пляну 0,2 проц. пераробак—вялікая лічба. „Пераробкі давесьці да нуля", вось за што змагаецца зараз брыгада.

Юдзілевіч—ударніца шоўкавай ленты ф-кі Кастрычнік.

Усе ахоплены падпіскай на пазыку і сацыялістычны чырвонец.

Да 1-га мая 7 рабочых ударнікаў з брыгады падалі заяву аб уступленьні ў партыю.

Брыгада тав. Пятліцкай, мела значны прарыў у выкананьні прамфінпляну. Дзякуючы сваячасовай мабілізацыі партыйцаў, камсамольцаў, ударнікаў, прарыў хутка ліквідавалі і брыгада выведзена ў рады перадавікоў. Прамфінплян выканан на 113 пр. Брыгада дабілася значнага зьнікненьня колькасьці пераробак, давяла прагулы і спазьненьні да нуля. Ёсьць эфэкт у эканоміі фарнітуры. Замест 10 кускоў палатна, брыгада выдаткоўвае толькі 6, замест 6-ці кускоў крэйды — выдаткоўваецца штодзенна толькі 4 кускі, таксама эканомяцца іголкі, гузікі і ніткі.

На фабрыцы разгорнута рацыяналізатарская работа. За першы квартал паступіла 168 рацыяналізатарскіх прапаноў. З 46-ці прынятых, 37 выканана, астатнія прапрацоўваюцца.

Прынятыя прапановы далі эканоміі 73227 руб. Толькі адна прапанова—Кац, Столяр, Бескіна, аб пераапрацоўцы адыходаў ваты, дае эканомію 72887 руб.

Прэмію ў суме 1960 руб. вынаходцы Кац, Бескін, Столяр перадалі ў фонд індустрыялізацыі краіны.

Ёсьць зрухі ў тэхвучобе і працы тэхгурткоў.

Зараз задача партарганізацыі фабрыкі — замацоўваючы дасягнутыя посьпехі, хутка ісьці наперад да новых перамог. К.

Брыгада тав. Авэрбах

На менскай швэйнай фабрыцы „Кастрычнік" асобныя брыгады, разгортваючы сапраўдныя сацыялістычныя мэтады працы, маюць надзвычай добрыя паказальнікі работы.

Брыгада тав. Авэрбах дабілася такой пастаноўкі работы, што дае добраякасную прадукцыю, зусім зьнішчан брак. Правільна расстаўлены сілы і гэта дае свае добрыя вынікі. Старшы брыгадзір тав. Авэрбах зьяўляецца сапраўдным гаспадаром у брыгадзе. Ён прыходзіць на работу раней другіх і аглядае становішча істужкі. Правярае, ці ёсьць падкладка і ці добраякасна яна зроблена, пасьля чаго праводзіць кароткую нараду брыгады, дзе прымаецца зьменна - сустрэчны плян.

Да прагульшчыкаў ужываюцца меры грамадзкага ўзьдзеяньня. Так, калі тав. Логіш зрабіў прагул, быў склікан сход брыгады, які вынес пастанову — занесьці прагульшчыка на чорную дошку.

Брыгада добра змагаецца за эканомію кожнага сантымэтра фарнітуры, за кожны гузік. Былі раней выпадкі, калі падкладка і гузікі вяляліся пад нагамі, а зараз гэтага ў брыгадзе няма. Штодзенна пасьля працы правяраюцца ўсе выдаткі.

Прамфінплян свой брыгада выканала ўжо на 100 проц., асабліва ўдарныя тэмпы ў рабоце паказваюць работніцы Сочак, Мысьліўчык і Рольбіна.

В. Ж.

Ударнікі сацыялістычных палёў

Дамо гародніну гораду

(*Менскі раён*)

Калгас імя Дзяржынскага арганізован на плошчы ў 300 *га*. З іх 66 *га* гароду. Гародны ўхіл, прымушае калгас цалкам перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з гэтым ухілам. Арганізаваны 3 вытворчыя брыгады: гародная, паляводчая і жывёлагадоўчая, да якіх прымацавана зямля, жывёла і інвэнтар. Гародная брыгада складаецца з 48 асоб, якая ў сваю чаргу разьбіта на групы. Група па капусьце, група па агуркох, па моркве, памідорах. Да брыгады прымацавана 13 коняй, адпаведны інвэнтар і вупраж. Насеньнем калгас быў забясьпечан, а таму сваячасова змог прыступіць да сяўбы.

Група ў дванаццаць асоб працуе на пасадцы буракоў, у групе выключна жанчыны. Заданьне—8 жанчын павінны засеяць гэктар, а група засявае больш чым два гэктары.

Бураковага насеньня цэлы мех быў прынесен паляводам, і работа пашла. Набраныя кубкі, міскі, падолы насеньня, хутка спаражняліся і зноў папаўняліся. У сьвежыя градкі 6 жанчын — калгасьніц мерна кідалі насеньня сталовых буракоў, а астатнія граблямі заграбалі зямлю, каб накрыць насеньне.

Разгорнутае тут-жа сацспаборніцтва дало свае вынікі. Калгасьніцы Пятрушкевіч Волька, Пятрушкевіч Мар'я, Бельская Вера, перагналі іншых з брыгады і скончылі першымі сваю баразну, засеяўшы амаль палову другой.

У працэсе працы выхоўваюцца сацыялістычныя адносіны да працы. Паступова ўся група пачала раўняцца па перадавых і ў далейшым тэмпаў не здавала.

— Густа-ж ня сейце — папярэджвае іх усьлед брыгадзір. — Нічога, калі густа—тады рассадзім—адказваюць калгасьніцы ўжо з-за ўзгорку і працягваюць далей працу. Пад вечар падлічылі вынікі ўдарнай працы. Група засеяла 2,02 *га* буракоў.

Рассаду для капусты падрыхтоўваюць парнікі. Акуратна зьбітыя дошкі насыпаны гноем і зямлёй. У астатніх праз шкло вокан, аж гарыць рассада капусты, пятрушка, раньняя радыска, гэта ўсё рыхтуецца да пасадкі. Больш позьняя рассада яшчэ толькі пачынае ўзыходзіць.

Падбор брыгадзіраў надзейны—кажа старшыня калгасу, — ніколі не здадуць, адпавядаюць свайму адказнаму прызначэньню. Герасімовіч Вера, Трушкевіч Сьцяпан, Трушкевіч Алесь — вось брыгадзіры, якія вядуць за сабой масы іншых калгасьнікаў. На сёньняшні дзень засеяна бульбы 16 *га*, гародніны: буракоў—2½ *га*, морквы—3 *га*, укропу—½ *га*, шчаўя — 3 *га*, пятрушкі—½ *га*. Сяўба разгортваецца з посьпехам.

Няма тэй таўкучкі ў праўленьні калгасу, якая была ў мінулым годзе, няма нарадаў, якія трэба было назначаць кожны дзень, і мяняць кожны дзень—а таму атрымліваласяі неразьбярыха. Зараз кожная брыгада мае заданьне, ведае свой інвэнтар, жывёлу і кожны дзень, кожны калгасьнік і калгасьніца ведае, што яму рабіць.

Праз кожныя пяць дзён у кніжку калгасьнікаў акуратна заносяцца іх выпрацаваныя дні.

* * *

У былой царкве, на ўзгорку пасялілі ясьлі і пляцоўка. У ясьлях 22 дзяцей, на пляцоўцы каля 40. У ясьлях два аддзяленьні: у першым больш дарослыя, у другім маленькія. Тут поўны парадак.

На кожным ложку можна ўбачыць надпіс, прозьвішча і імя кожнага дзіцяці, „ліквідавана абязьлічка", як кажуць калгасьніцы. У ложках бялізна чыстая, добры догляд, а таксама ежа. Будуецца новае памяшканьне для ясьляй, больш прасторнае, чым гэтае, але яшчэ ня скончана.

Праца на парніках.

Дэлегаткі стаяць у авангардзе барацьбы за гародніну.

Дэлегаткі Пятрушкевіч Параска, Трушкевіч Мар'я з гароднай брыгады, Пятрушкевіч Мар'я Янкава, Крышчановіч Варвара. Грышкевіч Ніна з ясьляй, Трушкевіч Алеся—кухарка зьяўляюцца лепшымі ў працы па веснавой сяўбе у барацьбе за гародніну. Але гэтыя дасягненьні ў працы дэлегатак не зьяўляюцца вынікам праведзенай з імі работы.

— Ужо здаўна заведзена, што дэлегаткі павінны быць першымі ў працы, то мы і працуем добра — адказваюць дэлегаткі.

З таго часу, як ўрачыста былі выбраны, дэлегаткі, больш іх ніхто ня склікаў і ні аб якіх справах ня гутарыў.



Паліўка капуснай расады ў гародзе імя Калініна.

Брыгада калгасу „Шлях Леніна"—першая выканала плян засыпкі насеньня

лёў у барацьбе за вясеньнюю сяўбу

у кніжку
ца іх вы-

пасялі-
к 22 дзя-
У ясьлях

але яшчэ

рдзе ба-

ка, Труш-
ды, Пят-
шчановіч
ясьляй,
ўляюцца
ой сяўбе
е гэтыя
не зьяў-

Праца на парніках.

...пуснай расады ў гародным калгасе імя Калініна.

Іх не прымацавалі ні да якіх устаноў. Ні заняткаў, ні праграмы няма. Старшыня калгасу тав. Бураў катэгарычна адмаўляецца ад усякіх сходаў і асабліва ад сходаў жанчын.

Бураў заяўляе, што ў часе веснавой сяўбы нельга і не патрэбна праводзіць ніякіх сходаў, а значыць ніякай работы. Таму ўся масавая работа і наогул культабслугоўваньне, якое павінна было быць асабліва разгорнута ў часе веснавой сяўбы, зусім згорнута па ініцыятыве Бурава.

Партыйная ячэйка, узначаліўшы ўдарную вытворчую работу калгасу, зусім не зварачае ўвагу на культурна-масавую, выхаваўчую, растлумачальную работу. У бліжэйшыя часы разам з разгортваньнем вытворчай работы па веснавой сяўбе, партыйная ячэйка павінна зьвярнуць асаблівую ўвагу на разгортваньне культурна-масавай работы ў калгасе.

Да рэчы для гэтага ёсьць усе ўмовы. Наяўнасьць хаты-чытальні і хатніка, двух настаўнікаў, камсамольскай ячэйкі, гэтаму ў поўнай меры спрыяе.

Зараз работу трэба разгарнуць, па растлумачэньню і рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) аб збожжазагатоўках, мясазагатоўках і гандлі збожжам і мясам, а таксама аб сельскагаспадарчым падатку, каб мабілізаваць масы калгасьнікаў і калгасьніц на арганізацыйна-гаспадарчае умацаваньне калгасу. Партыйная ячэйка, мабілізаваўшы ўдарнікаў, камсамольцаў і актыў — выканае гэты задачы.

К.

Адказ на ліст ударнікаў палёў Крыму

Калгасьнікі калгасу „Камінтэрн“, Магілеўскага раёну, Слабодзкага сельсавету, уключыліся ў конкурс „Правды“ па практычным ажыцьцяўленьні пастаноў ЦК УсеКП(б) ад 4-II і ЦК КП(б)Б ад 22-II аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Усьвядоміўшы ўсю правільнасьць арганізацыі працы па брыгадзе „Камінтэрнаўцы“ першыя ў раёне арганізавалі брыгады па вытворчым прынцыпе, да брыгад прымацаваны зямельныя вучасткі, цягавая сіла і інвэнтар. Распрацованы вытворчыя заданьні па брыгадах. Паляводчая брыгада на 26-IV узарала 81 *га* пад пасевам яравых і засеяла 80 *га* лубіну. З першага дня выхаду ў поле калгасьнікі ніводнага дня не прагулялі, з вялікім энтузіязмам узяліся па-бальшавіцку выканаць веснавую сяўбу.

Калгасьнікі распрацавалі ліст ударнікаў палёў Крыму, і ў адказ ударнікам Крыму калгасьнікі абвясьцілі сябе мабілізаванымі на пасьпяховае правядзеньне засеву яравога кліну з тэрмінам у 20 дзён. Паводле пляну яравы клін—650 *га*. Калгасьнікі высунулі сустрэчна 675 *га*.

Абгаварыўшы на сходзе пытаньне стварэньня сацыялістычнага фонду другой пяцігодкі пастанавілі засеяць у карысьць фонду 1 *га* ячменю, 1 *га* пшаніцы і збожжа, зьняць гэтыя гэктары засеву звыш пляну і пералічыць грошы ў сацуклад да канца першай пяцігодкі.

Т. Г.

Тэмпаў не здамо

(*Калгас „Полымя“, Рагоўскага сельсавету*).

У калгасе „Полымя“ сяўба распачалася 1-га мая. Узорана 80 *га*, забаранавана 71 *га*, засеяна 12 *га*. Насеньнем калгас забясьпечан на 100 проц.

Калгасьнікі працуюць вытворчымі брыгадамі на вызначаных ім вучастках. Коні і інвэнтар прымацаваны да брыгад і ў брыгадах—да кожнага калгасьніка.

Пасеўны плян даведзен да кожнай брыгады.

Калгас „Полымя“ тэмпаў сяўбы ня здасьць і ня ўступіць нікому свайго першага месца ў раёне.

М. Жукоўская.

Заслаўскі раён.

Дэлегаткі дапамагаюць выкананьню фінпляну

Дэлегаткі колгасу „Страх ворагам“, Лёзьнянскага раёну, абгаварыўшы фінплян другога кварталу па сваім сельсавеце, узялі на сябе канкрэтныя абавязкі.

Кожная дэлегатка абавязалася ня менш як на 10 рублёў завербаваць укладчыкаў у ашчадкасу.

Бярэце прыклад з дэлегатак к-су „Страх ворагам“. Яны зьяўляюцца дапаможнікамі ў выкананьні фінпляну і актыўнымі барацьбітамі за яго.

Н. М.

Калгасьніца Сапожнікава з прымацаванай да яе вупражкай і коньмі (Паўночны Каўказ).

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя Леніна

Зрабіць пералом у арганізацыі ясьляй у Случчыне

Лепшы сродак, які дапамагае скарыстаць поўнасьцю жаночую рабочую сілу—гэта ясьлі. Мінулыя гады яскрава паказалі, што там, дзе былі арганізаваны ясьлі, жанчыны ўвесь час мелі магчымасьць працаваць і тыя калгасы і саўгасы бліскуча спраўляліся як з сяўбой, так і з уборкай.

Аднак памылкі мінулых гадоў калгасамі Слуцкага раёну ня ўлічаны. З 175 калгасаў раёну ясьлі арганізаваны толькі ў 5 ці. Астатнія-ж калгасы ня маюць ні памяшканьняў, ні абсталяваньняў.

Некаторыя праўленьні калгасаў („Авангард", Прошчыцкага сельсавету, „Чырвоны маяк", Мусіцкага сельсавету, „1-мая", „Чырвоная горка", Сарагоўскага сельсавету, і іньш.) злачынна ігнаруюць справу арганізацыі ясьляй. Памяшканьні, якія ў мінулым годзе былі заняты пад ясьлямі, зараз ператвораны ў сьвірны або ў жылыя памяшканьні для калгасьнікаў, у той час, як можна падшукаць іншыя памяшканьні для жыльля. Мэбля з ясьляй распрадана калгасьнікам.

Дзеці паліваюць кветкі. Ясьлі тэкстыльнай ф-кі г. Масква.

Грошы, якія вызначаны для набыцьця новай мэблі і рамонту памяшканьняў, скарыстоўваюцца на іншыя патрэбы. Нічога ня робіцца па падрыхтоўцы кадраў ясельных працаўнікоў.

Раённыя арганізацыі, як райкалгассаюз, РВК і інш., ніякіх мер ня ўжываюць супроць гэтага ганебнага становішча. Наадварот, у райкалгассаюзе лічаць, што „арганізоўваць ясьлі ў калгасах—гэта зусім лішняя справа і што яна не прынясе ніякай карысьці".

Жанарганізатар тав. Крацэр таксама гэтым пытаньнем ня цікавіцца і ніякай растлумачальнай работы ў гэтым напрамку не праводзіць.

У перадавых калгасах Случчыны, напрыклад „Чырвоная Васея", „Камбайн", Камінтэрн" і інш., ясьлі ўжо арганізаваны. Гэтыя калгасы не адчуваюць недахвату рабочай сілы з прычыны таго, што жанчыны ўвесь дзень заняты на палявых работах, таксама як і мужчыны.

Сярод жанчын гэтых калгасаў шырока разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

У калгасе „Камбайн" арганізавана буксірная жаночая брыгада імя 8 га сакавіка.

Гэтыя добрыя прыклады можна і трэба скарыстаць у справе разгортваньня ясельнай кампаніі.

Астатнія калгасы Случчыны павінны раўняцца па перадавых. Раённыя арганізацыі павінны выправіць свае памылкі і ясьлі павінны быць арганізаваны.

Ш.

Дэлегаткі ў барацьбе за насеньне

У вёсцы Скароднае і Валаўслаўе, Ельскага раёну, на жаночым сходзе былі арганізаваны брыгады з жанчын дэлегатак - калгасьніц па зборы насеньня. Брыгады разьбіліся на вучасткі, сабралі шмат насеньня розных культур: тэхнічных культур—42 пуды, гародніны ўсялякай—15 пудоў. Брыгада працягвае працу па распаўсюджаньні насеннай пазыкі.

Дэлегаткі гэтых вёсак выклікалі ўсіх дэлегатак раёну прыняць удзел у гэтай палітычнай кампаніі па распаўсюджаньні насеннай пазыкі.

Брыгада: **Муляр Ганна, Глазко Сахвіна, Сахно Ганна, Маргевіч С., Сарокіна М. Фішман Б.**

Ясьлі пабудуем у тэрмін

Камуна „Чырвоны Кастрычнік" (Лагойскі раён) падрыхтавалася да вясны. Патрэбная колькасьць насеньня ссыпана і ачышчана. Жанчыны рэгулярна выходзяць на працу. Толькі кепска, што няма ясьляй. Але-ж па ініцыятыве дэлегатак усіх дзяцей зносяць у адну хату, а маткі ідуць і працуюць. Зараз брыгада камунараў ударна ўзялася за пабудову ясьляй. „Ясьлі пабудуем у тэрмін" заявіла брыгада і гэта будзе выканана.

Вара Філіповіч.

Лагойск.

Ясьлі даюць магчымасьць вучыцца

У камуне „Чырвоны артылерыст", Махіраўскага сельсавету, яшчэ ў 1929 годзе адкрыліся ясьлі, якія ўжо працуюць два з паловай гады. Загадчыца ясьлямі тав. Смаршкова праводзіць з камунаркамі сходы.

Маткі-камунаркі пасьля працы ідуць вучыцца на пункт па ліквідацыі няпісьменнасьці.

У ясьлях дзецям і чыста і сьветла. З дзецьмі праводзіцца выхаваўчая работа, яны ведаюць ужо, хто правадыр нашай рэвалюцыі, хто быў Ленін.

Усе маткі заклікаюць усіх беднякоў і сераднякоў, каб яны ішлі ў калгасы, якія даюць жанчыне магчымасьць вучыцца.

Я. Ш.

Полацкі раён.

Дэлегаткі Заслаўшчыны ў барацьбе за фінплян

Перавыбары дэлегацкіх сходаў па Заслаўскаму раёну закончыліся 15-IV—32 году, і дэлегаткі прыступілі да працы. Сваю тэарытычную вучобу яны зьвязваюць з практычнай працай, актыўна дапамагаюць выкананьню плянаў 4-га заключнага.

Дэлегаткі калгасу імя Сталіна (Траскоўскі сельсавет) шляхам мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў забясьпечылі свой калгас поўнасьцю гародным насеньнем. Распаўсюдзілі акцыі трактарацэнтру на 140 руб.

Дэлегаткі калгасу імя Дзяржынскага ў колькасьці 35 асоб уступілі ўкладчыкамі ашчадкасы і завербавалі 115 новых укладчыкаў.

Дэлегацкі сход пры пагранатрадзе, які складаецца з жонак вайсковых, унёс 240 р., як сацыялістычны чырвонец. Дэлегаткі Заслаўшчыны і надалей не павінны здаваць узятых тэмпаў. **Фейгіна.**

Тав. Квятная работніца абутковай ф-кі (г. Менск) арганізавала дэлегацкі сход у падшэфным Сеніцкім с-савеце.

Усе сілы, усе сродкі—на выкананьне фінпляну

Фінансавы плян першага кварталу 1932 году ў Слуцкім раёне выканан усяго на 80 проц. Выкананьне пляну 2-га кварталу ідзе вельмі марудна.

Масава - растлумачальная работа вакол гэтага пытаньня адсутнічае. Пралетарская грамадзкасьць на барацьбу за сваячасовае і поўнае выкананьне і перавыкананьне ўсіх відаў фінансавых мерапрыемстваў не мабілізавана.

Па цэлым радзе сельсаветаў, як Мусіцкім, Бокшыцкім і Прошчыцкім і інш. зусім нічога ня робіцца ў напрамку мабілізацыі сродкаў. Ашчадкасы Случчыны яшчэ не перабудавалі сваёй работы па-новаму.

Але разам з ганебна адстаючымі сельсаветамі ёсьць і такія, як Івана-Агародніцкі, Амговіцкі і інш., дзе ў выніку ўдарнай працы плян усіх абавязковых плацяжоў (страхоўка, падатак, самаабкладаньне, аднаразовы збор і інш.) выканан і перавыканан.

У Івана-Агародніцкім сельсавеце для садзейнасьці ў працы сельсавету па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў, па калгасах арганізаваны ўдарныя брыгады, якія сыстэматычна дапамагаюць сельсавету на гэтым важнейшым вучастку, сыстэматычна вярбуюць новых укладчыкаў у ашчадкасу.

У выніку ўдарнай працы арганізаваная брыгада фінфронту з лепшых калгасьнікаў-ударнікаў і калгасьніц ў калгасе „Камінтэрн" завербавала ўкладчыкаў у ашчадкасу на суму 1.500 руб.

Насьценгазэта - штодзенка „За сацыялізм" сыстэматычна асьвятляе ход работы брыгады фінфронту.

На нядаўным зьлёце ўдарнікаў фінансавага фронту Случчыны за лепшую, сапраўды ўдарную работу па мабілізацыі сродкаў прэміяваны наступныя ўдарнікі і ўдарніцы: Бруй Алеся — член Івана-Агародніцкага сельсавету, батрачка—калгасьніца, за 100 пр. выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў на яе вучастку прэміявана прамтаварамі на 50 руб. Сушчова—работніца гарспажыўтаварыства—за ўдарную работу прэміявана граматай. Гурыновіч (Бокшыцкі сельсавет) — за ўдарную работу па выкананьні фінпляну прэміявана 50 рублямі. Брасевіч (Урэцкі сельсавет) прэміявана на 50 руб. Лосіна—працаўніца пошты—прэміявана на 50 руб.

Алесь Шпакоўскі.

Дэлегаткі ўдарніцы фінфронту

Дэлегаткі калгасу „1-е мая", Слуцкага раёну, шырока разгарнулі працу па фінпаходзе. Вылучаныя брыгады вярбуюць укладчыкаў у ашчадкасу.

Добра сябе праявіла ў гэтай працы дэлегатка тав. Кац Шыфра і Бараноўская, якія завербавалі 20 новых укладчыкаў на суму 55 руб. Але дэлегаткі калгасу „1-е мая" не павінны на гэтым спыняцца, а і надалей праводзіць працу па вярбоўцы ўкладчыкаў у ашчадкасу.

Дэлегаткі Случчыны, бярэце прыклад з працы дэлегатак калгасу „1-е мая" Кац Шыфры і Бараноўскай. Я. Кучур.



Крычаўскі цэментны завод уваходзіць у лік „518".

АРГАНІЗУЕМ МАСЫ КАЛГАСЬНІКАЎ І ЎСЮ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ

У барацьбе за якасьць сацыялістычнай жывёлагадоўлі

Новае кіраўніцтва застала ў саўгасе Старая-Беліца, Уваравіцкага раёну, поўную безгаспадарчасьць. Насеньне і кармы былі разбазараны.

Калі пастанова ЦК УсеКП(б) і НКЗ СССР аб рабоце жывёлагадоўчых саўгасаў была дасканальна прапрацавана на вытворчых нарадах і на агульным сходзе—гэта ўзварушыла рабочых і работніц і мабілізавала іх вакол задач, пастаўленых партыяй і ўрадам перад жывёлагадоўчымі саўгасамі.

Безгаспадарчасьць паступова зьнішчалася. Для забесьпячэньня рабочай сілай на час веснавой сяўбы заключылі дагавары з калгасамі, арганізавалі пастаянныя вытворчыя брыгады, за якімі замацавалі вучасткі зямлі, сельскагаспадарчы інвэнтар і цягавую сілу.

Арганізавалі 4 сацыялістычныя гасп. разрахунковыя брыгады імя трэцяй гадавіны сацспаборніцтва і ўдарніцтва, імя вялікага пралетарскага сьвята—1 мая. Плян здачы таварнай прадукцыі ў першым квартале 1932 году перавыканан. Замест 45 цэнт.—здана 46,2. Высунут сустрэчны плян здачы таварнай мясной прадукцыі на 1932 г.—2.200 цэнт., замест 2.088 цэнт. Узяты самаабавязацельствы скончыць сяўбу раней тэрміну на 5 дзён.

Два старшыя сьвінары і 15 сьвінарак уключыліся ў конкурс на лепшага сьвінара. Першым у гэты конкурс уключыўся старшы брыгадзір першай гаспадарча-разрахунковай брыгады т. Жарын. Ён працуе даўно ў саўгасе, як лепшы ўдарнік, быў вылучан на курсы сьвінароў і скончыў іх. Адыход маладняка на сьвінарніках, якія абслугоўваюцца брыгадай Жарына, даведзен да нуля, а раней, да Жарына, было адыходу 17 проц.

Уключыўшыся ў конкурс на лепшага сьвінара, Жарын са сваёй брыгадай высунуў цэлы рад абавязацельстваў: поўнае захаваньне стада, выкананьне плянаў здачы таварнай і мясной прадукцыі, 100 проц. пакрыцьцё матак у тэрмін і ліквідацыя ялавасьці, поўная чыстата ў сьвінарніках, арганізацыя догляду на аснове запатрабаваньняў зоавэтэхнікі і інш.

Аўгуль Алена—лепшая работніца-сьвінарка з брыгады Жарына. У саўгасе працуе доўгі час. Як лепшую з лепшых, яе вылучылі на адказную работу—у сьвінарнік № 4, дзе яна дагляз е 87 ад'ёмышаў. На яе сьвінарніку зусім няма адыходу.



Ударніца Бецько А. за працай. Саўгас Старчыцы Чырвонапольскі р.

Алена клапоціцца аб тым, каб сьвінарнік заўсёды быў забясьпечан патрэбнымі кармамі і падсьцілам. Яна раней усіх зьяўляецца на сьвінарнік і пакуль астатнія работніцы прыходзяць, яна ўжо ачышчае станкі. Поўнасьцю прытрымліваецца норм кармленьня. Ніколі ня лічыцца з гадзінамі, калі гэтыя гадзіны ідуць на карысьць паляпшэньня сьвінагадоўлі. На сьвінарніках, акрамя кукурузы, больш ніякіх кармоў ня было, але, ня гледзячы на гэта, парасяты маюць амаль такую-ж вагу, як і пры канцэнтраваных кармох.

За ўдарную работу на сьвінарніку, сваячасовае кармленьне, ліквідацыю адыходу, Аўгуль Алена рабочым актывам была прэміявана пачэснай граматай ударніка. Алена — камсамолка. Камсамольскі калектыў саўгасу ўсклаў на яе рад камсамольскіх нагрузак—яна загадчык бібліятэкі саўгасу, загадчык сэктару масавага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Сваёй прыкладнай практычнай работай Алена ўцягвае ўсё новых і новых работніц-сьвінарак ва ўдарныя брыгады.

Падлобнікава — сьвінарка — ударніца гэтай-жа брыгады. Працуе ў саўгасе ўсяго каля 5 месяцаў, даглядае 48 сьвіней і 249 парасят. У сваёй рабоце ўжывае сапраўдныя бальшавіцкія мэтады працы. Парасят і сьвіней Падлобнікава корміць сваячасова, згодна ўстаноўленага ўнутранога распарадку на сьвінарніку. У станках заўсёды чыста. Падлобнікава дабілася памяншэньня адыходу. Да яе прыходу адыход быў 25 проц. Зараз адыход зьменшан да 3 проц. Уключыўшыся ў конкурс, Падлобнікава абавязалася процант адыходу давесьці да нуля.

Другая гаспадарча-разрахунковая брыгада, якая ўключылася ва ўсесаюзны конкурс, гэта брыгада старшага сьвінара—ударніка Раманава. За ўдарную работу на сьвінарніках, за добрыя паказальнікі сваёй работы, за захаваньне маладняка Раманаў быў прэміяваны чатыры разы. Раманаў дабіўся таго, што за адзін толькі месяц яго работы на сьвінарніку № 1 адыход зьнізіўся з 25 да 3 проц.

Кавалёва — сьвінарка — ударніца. Працуе ў саўгасе нядаўна, але за гэты кароткі час сваёй работы дабілася добрых паказальнікаў работы. Кавалёва даглядае 42 кныры. Корміць яна іх сваячасова. У станках—чыстата. Ня гледзячы на недахват канцэнтраваных кармоў, кныры маюць добры выгляд. За сваю ўдарную работу Кавалёва прэміявана пачэснай граматай ударніка.

* * *

Апіраючыся на энтузіястаў—працаўнікоў сацыялістычнай сьвінагадоўлі, на такіх, як Жарын, Раманаў, Аўгуль, Падлобнікава, Кавалёва і інш., паляпшаючы штодзеннае апэрацыйнае кіраўніцтва ўсёй работай у саўгасе, парт'ячэйка і трыкутнік саўгасу павінны павесьці ўвесь рабочы калектыў на шлях далейшых рашаючых перамог у разьвіцьці сацыялістычнай сьвінагадоўлі, у выкананьні саўгасам сваіх абавязацельстваў перад пралетарскай дзяржавай.

В. Русовіч.

НА БАРАЦЬБУ ЗА СТОПРОЦАНТНАЕ ЗАХАВАНЬНЕ МАЛАДНЯКА

Ударніцы Серафімовіч Арына і Гуткоўская Мар'я выканалі абавязацельствы

СТФ калгасу „Батрак", Амговіцкага сельсавету,—адна з буйнейшых сьвінафэрм у Слуцкім раёне, якая налічвае ўсяго сьвіней 494 штукі, у тым ліку 6 кныроў, 272 сьвінаматкі, 153 штукі падсьвінкаў і рэшта выбракаваныя.

Плян здачы (продажу) мясной таварнай прадукцыі дзяржаве калгас „Батрак" пасьпяхова выконвае і перавыконвае. За 1931 г. калгас плян мясазагатовак перавыканаў на 47 *цнт.* Плян першага кварталу 1932 году таксама перавыканан. Замест 21 *цнт* калгас здаў 37; плян другога кварталу 1932 году выканан.

Плян пакрыцьця сьвінаматак поўнасьцю выканан. Пакрыта ў студзені месяцы 85 сьвінаматак, у лютым — 62 сьвінаматкі, у сакавіку—38, у красавіку—19.

У красавіку было 147 штук парасят. СТФ калгасу „Батрак" першая ў раёне ўключылася ў конкурс на лепшага сьвінара, абвешчаны Наркамземам СССР і Наркамземам БССР. На агульным сходзе сьвінарак умовы конкурсу былі распрацаваны. Быў высунуты сустрэчны — захаваць да часу адлучкі ня менш 10 парасят ад кожнай сьвінаматкі вагою ў 10 *кг* кожная.

Паасобныя сьвінаркі таксама ўзялі на сябе рад практычных самаабавязацельстваў, напрыклад, сьвінарка-ўдарніца Серафімовіч Арына ўзяла на сябе самаабавязак—дабіцца поўнага зьнішчэньня адыходу маладняка і забясьпечыць сутачную прыважку парасят ня менш 400 *гр.* Яна ўжо дабілася поўнага зьнішчэньня адыходу маладняка і забясьпечыла сутачную прыважку парасят ня менш 400 *гр.*

Сьвінарка Гуткоўская Мар'я ўзяла на сябе самаабавязак — дабіцца поўнага пакрыцьця сьвінаматак, поўнага зьнішчэньня адыходу маладняка. Зараз ужо ёсьць вынікі—адыход маладняка зьнішчан, сьвінаматкі пакрыты на 100 проц.

На сходзе быў арганізован штаб па садзейнасьці і кіраўніцтве конкурсам у калгасе, Насьценгазэта СТФ (апрача згульна - калгаснай), сыстэматычна асьвятляе ход конкурсу. У працы насьценгазэты прымаюць удзел усе сьвінаркі і калгасьнікі. Арганізован гурток па аўладаньні тэхнікай сьвінагадоўлі, які ўжо больш месяца працуе рэгулярна. Гурток наведваюць усе сьвінаркі.

Адразу-ж пасьля ўключэньня ў конкурс, догляд сьвіней значна палепшыўся. Адыход маладняка замест 50 проц. зьнізіўся да 5. Лепшыя якасныя паказальнікі даюць сьвінаркі-ўдарніцы Серафімовіч Арына і Гуткоўская Мар'я.

На СТФ шырока разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Ініцыятарам і арганізатарам сацспаборніцтва на СТФ зьяўляецца ўдарніца-сьвінарка Серафімовіч Арына.

СТФ калгасу „Батрак" зьяўляецца кандыдатам на сацыялістычнае пяршынства. Па ёй павінны раўняцца ўсе СТФ БССР і ў першую чаргу Слуцкага раёну.

Ш.

Пад суд злоснага безгаспадарніка

Сабралася нарада сьвінарак фэрмы калгасу „Чырвоны прамень". Жанчыны сабраліся хутка і з ахвотаю. Прышоў і загадчык фэрмы тав. Валенціёнак.

Нарада выявіла, што на фэрме поўны правал. Увесь маладняк асеньняга прыплоду загінуў у колькасьці 280 парасят, ніводнага не захавалі.

Злучная кампанія праходзіць бяз усякага ўліку і рэгуляваньня. Колькі матак пакрыта, якія і калі павінны парасіцца — ня ведае ні загадчык фэрмы, ні працуючыя. Станкі паламаліся, і больш дужыя сьвіньні загрызаюць слабых, ад чаго слабыя гінуць. Аб гэтым добра ведае загадчык фэрмы Валенціёнак, але нічога ня робіць. Ніводнага цэлага вядра няма на фэрме, якая налічвае 300 сьвіней. Нават дзіравых і тых не хапае. У той час, калі трэба карміць сьвіней, з-за вёдзер заўсёды сварка. Сьвінаркі пілюць і колюць дровы для кухні, калі нават пілы спраўнай на фэрме няма. У выніку ўсіх гэтых непаладак гіне ня толькі маладняк, але і гадавалыя сьвіньні.

Загадчык кожны дзень п'янствуе, яму няма справы да фэрмы. „Дохлі і будуць дохнуць"— гаворыць ён, другога выйсьця ён ня бачыць. Крывец Тацьцяна, Жарнасек і інш., якія працуюць на фэрме, паказалі выйсьце. Яны катэгарычна патрабуюць зьняць з працы загадчыка фэрмы. Але мала зьняць, яго трэба аддаць пад суд, як злоснага безгаспадарніка. Яны заявілі, што ўсе непаладкі можна ліквідаваць, але патрэбна кіраўніцтва як з боку загадчыка, так і праўленьня калгасу.

Брыгадзір сьвінарак Тацьцяна Крывец ня раз заяўляла аб усіх недахопах загадчыку, яна сваячасова ўздымала пытаньне аб правільным кармленьні сьвіней па нормах, але віна яе ў тым, што яна сваіх добрых заўваг не давяла да канца. Трэба было праз праўленьне, праз друк дабівацца паляпшэньня працы фэрмы.

Сьвінаркі патрабуюць вытворчыя нарады на фэрме ўвесьці ў сыстэму. Нарада сьвінарак, агульны сход калгасу і зьлёт ударніц намецілі рад мерапрыемстваў для аздараўленьня фэрмы. Трэба неадкладна іх правесьці ў жыцьцё.

Б.

Нарыс ЮР. ЛЯВОННАГА

Ударніцы камінтэрнаўскай СТФ

— Сьвінушніцы... Гразнухі... Ці добрае-ж сальца вашых падсьвінкаў. Адкарміліся, нябось... Ой, ды ўда-рніцы...

Так клілі з калгасьніц-сьвінарак ворагі—кулакі і падкулачнікі і інодзі па несьвядомасьці і бестактоўнай тугака жартлівасьці іх падтрымоўвалі і некаторыя калгасьнікі.

Можа, іншы раз, і сапраўды цяжкай, тупой няпрыемнасьцю, клаліся на сэрца гэтыя словы. Можа, часамі, шавялілася сумненьне—і дзяўчаты крыўдзіліся і злаваліся...

Але зараз Матруна Мельнікава, Хрысьціна Мельнікава, Зося Папкова, Аксіньня Ігнаценкава (ужо не гаворачы пра старэйшага сьвінара—загадчыка СТФ) цьвёрда і пераканана адказваюць на закіды:

— „Сьвінушніцы". Ніштo-о. Хаця няпрыгожа, ды смачна. Мы ведаем сваю справу, любім яе, і працуем, як належыць... Зразумела? І мы дамо дзяржаве тое, чаго яна ад нас патрабуе...

І брыгада сьвінароў калгасу „Камінтэрн", Слабодзкага сельсавету практычна даводзіць;

— Што посьпех у сацыялістычнай сьвінагадоўлі забясьпечваецца далёка не аднымі ўзорнымі сьвінарнікамі, хоць-бы яны ў сто раз перавышалі навейшыя ўдасканаленьні буржуазных гаспадарак Захаду; гэта мала яшчэ,—што, наадварот, сакрэт перамог—ва ўзорных, сьвядомых адносінах людзей да працы пры, нават, невыстарчальных матар'яльных мажлівасьцях.

— Што задача партыі і ўраду аб вырашэньні ў асноўным мясной праблемы на працягу другой пяцігодкі імі цалкам усьвядомлена і ва ўмовах свайго калгасу непасрэдна рэалізуецца.

І вось — ставасьмімэтровы драўляны будынак. Яшчэ поўнасьцю не закончаны. Яшчэ, здаецца, учора — з-пад рыштаваньняў.

Гэта—сьвінарнік, у якім зараз 137 парасят, 71 падсьвінак, 11 кныроў, 56 сьвінаматак, ад якіх да канца году трэба атрымаць прыплоду каля 400 штук.

— І атрымаем—упэўнена кажа загадчык СТФ Іван Фралоў,— дрэнна вось толькі, што сьвінарнік не закончан... І атрымаем, бо толькі за апошнія 10 дзён стада выросла на 84 галавы. Адыход маладняка ў 1930 годзе складаў 2 проц., у 1931 годзе—1 проц. Сёлета адыходу амаль што няма.

У сьвінарніку—парадак. Штодня чысьцяцца станкі, мяняецца подсьціл. Пасьля кожнага прыёму ежы мыюцца кармушкі. На дзьверцах кожнага станка—цэтлік з адзнакаю ўзросту, пароды сьвіньні, тэрміну злучкі ці апаросу.

Ударная брыгада сьвінароў шчыра зацікаўлена ва ўзьняцьці якасьці прадукцыі фэрмы, зацікаўлена ў выкананьні і перавыкананьні свайго прамфінпляну. У ёй—9 чалавек. Канчаткова ліквідавана абязьлічка—і ў гэтым адна з умоў, высунуўшых камінтэрнаўскую СТФ на першае месца ў раёне.

Кожны член брыгады ведае сваё месца. Усе сьвіньні разьмеркаваны на 4 групы. Да кожнае групы прымацавана адна асноўная сьвінарка, якая і адказвае за догляд яе. Адна работніца працуе ў зьмену па ўсіх чатырох групах, дзьве завіхаюцца на кухні і адна сочыць за падвозкаю вады і кармоў.

Кормяцца сьвіньні па так званых нормах Папова пры суровай рацыяналізацыі кармоў. На дарослую сьвіньню адпускаецца ў дзень 3,5 кармовых адзінкі (за адзінку бярэцца 1 кілёграм мукі), на сярэднюю—2,5 і на малую—1,5. Бульбы на дарослую—4 кілёграмы, сярэднюю—2,5 і на малую—ад 1 да 2 *кг*. Дарослыя кормяцца 2 разы ў дзень, маладняк—3. Посьпех у гэтай справе заваёўваюць удала падабраныя для фэрмы людзі.

Брыгада сьвінароў у „Камінтэрне" моцна згуртавана агульнай адданасьцю сваёй справе і непасрэдным, жывым энтузіязмам. Прыкладам сапраўднай зацікаўленасьці да маладняка і сьвінога пагалоўя можа служыць добраахвотнае жаданьне дзяжурыць каля паросных матак. Гэтае жаданьне звычайна выліваецца ў „спрэчкі": кожная сьвінарка хоча лепш прыняць і дагледзець нованароджаных... І дзяжураць ноч напралёт. Усім сьвінаром праца ўлічваецца ў разьмеры 1,25 працадня—як за цяжкую работу. Брыгада ня раз прэміявалася—грашмі, мануфактурай.

Добрасумленныя, узорныя адносіны да сваіх абавязкаў перш за ўсё выяўляе загадчык СТФ тав. Фралоў. Іван Фралоў скончыў у Борках двухмесячныя сьвінагадоўчыя курсы. Гэта ён адразу-ж пасьля прыезду з курсаў завёў на фэрме кармленьне па норме, зрабіў суровы падзел функцый сьвінарак, увёў дакладны ўлік выдаткаваньня кармоў, тэрмінаў злучкі і апаросу. Да яго працавалі брыгада ў траіх—у брудным і цесным сьвінарніку.

Іван Фралоў, апрача асноўнай работы, мае безьліч грамадзкіх нагрузак.

Дзяўчаты-сьвінаркі ведаюць, што за першы квартал іх СТФ некалькі недадала дзяржаве таварнай прадукцыі. І яны ўпарта змагаюцца за якасьць стада, за выхад таварнай прадукцыі да канца году.

— Да канца году прадамо дзяржаве з перавышэньнем, будзьце ўпэўнены,—гаворыць, усьміхаючыся шырокай і ветлівай усьмешкай,

Ударніца даярка Вольга Шычко. Саўгас „Сенга", Жыткавіцкага раёну.

Хрысьціна Мельнікава,—мы высоўваем сустрэчны: замест 100 здамо 120, а то і 130 галоў.

— Вядома, здамо 130,—паўтарае Аксіньня Ігнаценкава—і вочы яе мільгацяць іскрынкамі: бо ў нас з другога кварталу буйны рост пачнецца... Ого, стада расьце.

І гэта—ня пустыя словы: злучную кампанію 1931 году брыгада сьвінароў сустрэла падрыхтавана. У выніку ялавых сьвінаматак амаль няма.

Брыгада разгарнула сацыялістычныя мэтады працы ўнутры свайго калгасу, у першую чаргу выклікаўшы на спаборніцтва малочную фэрму. Пасты штодзенкі „За сьцяг правды" сыстэматычна правяраюць ход выкананьня ўсіх пунктаў сацумовы. Члены брыгады самі актыўна ўдзельнічаюць у штодзенцы і іхнія допісы значна дапамагаюць справе (так, дапамагла заметка аднэй сьвінаркі пра несваячасовае забесьпячэньне кармамі, пра неабходнасьць набыцьця мэдыкамэнтаў і інш.).

Аднэй з першых брыгада ўключылася ва ўсебеларускі конкурс на лепшага сьвінара. Умовы конкурсу тады-ж абмеркавалі на вытворчай нарадзе; цяпер яна даведзена да кожнай калгасьніцы. У брыгадзе зразумелі, што конкурс—не самамэта, а сродак у барацьбе за далейшае разьвіцьцё сьвінагадоўлі.

Сьвінары просяць праўленьне неадкладна ацяпліць сьвінарнік і вызначыць неабходную колькасьць кармоў шляхам мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, а таксама забясьпечыць правільную грашовую аплату, згодна пастановы Калгасцэнтру БССР, тэй сьвінарцы, якая здасьць цэнтнэр таварнай прадукцыі.

Брыгада выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва ўсе сьвінагадоўчыя таварныя фэрмы Магілеўскага раёну.

Сваіх посьпехаў і дасягненьняў камінтэрнаўская СТФ дабілася выключна дзякуючы правільнаму кіраўніцтву калгаснай парт'ячэйкі.

Тав. Фралоў так і гаворыць:

— Сакратар ячэйкі ў нас на фэрме штодня бывае,—цікавіцца справай і дзелавыя прапановы дае. Каб не ячэйка, было-б дрэнна, бо старшыня калгасу, трэба вам сказаць шчыра, не надае СТФ належнай увагі...

І ён пералічвае:

— Пастуха нам не даюць, а без яго—цяжка; сьвіней няма як на выган выпусьціць. Работніц адрываюць на іншыя вучасткі... А што наконт вэтэрынарнага нагляду—то пакуль за шкірку ня выцягнеш — фэльчар ніколі сам ня прыедзе. Зноў-жа вагі дагэтуль ніяк не атрымаем... І вада далёка — трэба студню капаць...

Вось...

Зжыўшы гэтыя паасобныя недахопы, разьвіваючы і надалей баявыя тэмпы росту, камінтэрнаўская СТФ здолее стаць у шарэнгу лепшых фэрм ня толькі раёну, але і ўсёй рэспублікі. Недарма-ж у ёй сапраўды па-бальшавіцку працуюць, змагаючыся за сацыялістычную сьвінагадоўлю, лепшыя ўдарніцы калгасу.

Магілеўшчына, красавік.

У саўгасе „Крычаў" прыкладна даглядаюць сьвіней

У саўгасе „Крычаў" догляд сьвіней пастаўлен прыкладна. Загадчык матачна-парасятнага цэху тав. Мінаева—камсамолка, сваім прыкладам ударнай работы вядзе за сабой астатніх работніц сьвінарніку. Кормяць ад'ёмышаў строга па рацыёну вэтдоктара. Часта іх выпускаюць на паветра. Усяго ёсьць 218 парасят і 103 ад'ёмышы, якія адчуваюць сябе добра ў чыстым і цёплым хлеве дзякуючы сваім шэфам камсамолкам - даглядчыкам. Вядзецца жорсткая барацьба з адыходам. Сьвінаматкі кормяцца лепш, яны пераведзены на групавое ўтрыманьне па 9—15 шт.

Зараз неабходна прыняць захады да ўстанаўленьня вэнтыляцыі ў сьвінарніках.

Галя.

Лепшыя ўдарнікі прэміяваны

На малочна-таварнай фэрме калгасу „Полымя" на 1-е мая ёсьць усёй жывёлы—317, у тым ліку: дойных кароў—130, няцельных—94, вытворнікаў—7, цялят да аднаго году—86. З пачатку году здана дзяржаве 9.600 літраў малака. Фэрма два разы прэміявана. Загадчык фэрмы тав. Паўлёнак прэміяваны ў суме 50 руб

Праўленьне калгасу ў гонар сьвята прэміюе лепшых ударнікаў на фэрме: Бабровіч Тэклю, Дэсейн Ганну, Сокала Пятруся, Ульчыца Цімоха і іншых. Гэта лепшыя ўдарнікі, якія, ня гледзячы на ўсе труднасьці, цьвёрда стаялі на сваім пасту. Яны ня маюць прагулаў і больш году працуюць на фэрме.

М. Жукоўская.

Кулацкая вылазка павінна быць біта

Калгас імя Сталіна, Вальсьмілаўскага сельсавету, Слуцкага раёну, груба скажае пастанову ЦК УсеКП(б) ад 26-га сакавіка 1932 году. Замест таго, каб арганізаваць дапамогу і садзейнасьць калгасьнікам, якія ня маюць каровы і дробнай жывёлы, у куплі і гадоўлі маладняка для асабістых патрэб, „мудрыя праўленцы" калгасу імя Красіна разьмеркавалі паміж калгасьнікамі парасят і нават тыя калгасьнікі, якія маюць па 2—3 сьвіньні—старшыня праўленьня тав. Чыжтаксама атрымалі „сваю долю".

Трэба рашуча ўдарыць па кулацкім разбазарваньні калгаснай жывёлы.

А. Ш.



Саўгас Старчыцы, Чырвона-Слабодзкага раёну (сьвінаводч.). Ударніца Русенко. Сьвінаматка з 8 парасятамі.

БОЛЬШ УВАГІ ТРУСАГАДОЎЛІ

Трусагадоўля павінна атрымаць самае шырокае распаўсюджаньне ў калгасах, фабрычна-заводзкіх цэнтрах і гарадох БССР. Трусы даюць мяса, пух і скуркі. Іх мяса—белае і надта спажыўнае. Скурка труса ідзе на шапкі, на дзіцячыя шубкі і г. д. З некаторых пород труса здабываюць пух, з якога вырабляюць добры фэтр, а таксама розныя вязаныя вырабы.

Праца па разьвядзеньні трусоў простая і ўсім даступная. Плодзяцца трусы надзвычай хутка, адна самка за лета дае каля 20 трусянят, якіх узімку ўжо можна скарыстаць на мяса.

Лепшы спосаб утрыманьня трусоў—у клетках (скрынках вышынёю ў адзін аршын і некалькі больш—у даўжыню). Клетку робяць так: звычайную скрынку ставяць на бок, крышку замяняюць рамкай, якую заплятаюць дротам, каб стварылася ня густая сетка. З боку рамка падвешваецца на петлі, каб яна адчынялася і зачынялася. У дне робяць дзіркі (да 1 *см*), праз якія будзе сьцякаць мача. На дно атрыманай такім чынам клеткі кладуць салому і памяшчаюць 1 труса. Па некалькі штук можна трымаць у аднэй клетцы толькі маладняк да 4-х месяцаў, або ня котных самак. Гэтыя скрынкі ставяцца ў аборы, або проста на дварэ пад павецьцю, але не на правеі. Трусы зусім не баяцца холаду, нават і ўзімку, але ім перашкаджае вільгаць, таму іх нельга памяшчаць пад адкрытым небам, на дажджы. Трусоў трэба берагчы ад грызуноў, кошак і сабак.

Пры разьвядзеньні вялікай колькасьці трусоў можна іх утрымліваць ня ў клетках, а ў загонах. Для гэтага адводзяць вучастак зямлі, адгароджваюць яго дротавай сеткай, каб трусы не пабіліся і не ўцяклі—сетка закопваецца ў зямлю на глыбіню ня менш $^3/_4$ мэтра (1 арш.). У загоне трусы рыюць норы, у якіх жывуць і плодзяцца.

Улетку трусоў можна карміць травою з гародаў, рознымі лісьцямі, а ўзімку сенам. Добра даваць кораньплоды, бульбу, авёс, але ў крайнім выпадку можна абыйсьціся і бяз гэтага. Трусы ахвотна ядуць нават такую траву, якую ня есьць ніякая другая жывёла: розныя горкія сьмяцьцёвыя травы, асот, палын і г. д. Бязумоўна, такіх атрутных траў, як балігалоў, белена, зялёны мак і інш. трусам даваць нельга. Маладым трусянятам ня трэба даваць капусту. Узімку лепш за ўсё даваць трусам у корм сена—канюшыну, або мяккае ляснае сена. Таксама можна для трусоў сушыць на зіму зялёныя лісьці дрэў.

Кормяць трусоў тры разы ў дзень. Маладых трусянят трэба карміць больш часта. Улетку паіць трусоў пры сакавітым корме ня трэба, пры сухім корме трусоў трэба паіць. Даросламу трусу даюць 200—300 грам сена і 200 грам збожжа ў дзень.

Да размнажэньня трусоў звычайна прыступаюць раньняй вясной, злучаючы самак у пачатку сакавіка. Самка павінна быць не маладзей 8—9 месяцаў, каб ад яе атрымаць здаровае племя. Самец павінен быць узростам каля году.

Праз 30—31 дзень трусіха прыносіць прыплод ад 5—10 трусянят. Перад акотам яна робіць з подсьцілу і сваёй шэрсьці гняздо. Трусяняты родзяцца голымі і сьляпымі і першы час сядзяць у гнязьдзе пакрытыя пухам маткі. У гэты час іх нельга чапаць. Толькі праз два-тры тыдні, калі трусяняты пачнуць выходзіць з гнязда, можна ачышчаць у клетцы падсьцілку.

На працягу месяца трусяняты кормяцца малаком маткі, пасьля чаго іх адсажваюць. Калі трусоў разводзяць на племя, лепш пакідаць маладых трусянят пад маткай на два-тры месяцы. Тады яны выйдуць больш здаровымі і моцнымі. Дробных трусоў аднаго памёту трымаюць усіх у клетцы і праз два месяцы самак трэба адсажваць асобна ад самцоў.

Трусы бываюць мясныя, скуркавыя, пухавыя і для агульнага карыстаньня. З мясных трусоў самыя буйныя бельгійскія (Фландра). Яны дасягаюць 4,9—6,5 *кг* жывой вагі. З скуркавых трусоў у нас разводзяць расійскага гарнастаевага труса дробнай пароды, да 2,8 *кг* жывой вагі, ангорскага пухавага труса вагой да 3,2 *кг* з белай, тонкай, доўгай, мягкай поўсьцю. З аднаго труса за год можна набраць 100—200 грам пуху. З трусоў агульнага карыстаньня, найбольш цікавы—блакітны венскі да 4—5 *кг* жывой вагі.

Да апошняга часу трусагадоўля разглядалася як непатрэбная галіна і амаль не сустракала да сябе сур'ёзных адносін. Між тым трусагадоўля мае надзвычай важнае значэньне як у вырашэньні мясной праблемы, так і з пункту погляду забесьпячэньня прамысловасьці скуркамі, пухам, а таксама для экспарту.

На 10 мая па БССР арганізавана 139 калгасных трусагадоўчых таварных фэрм, але гэтыя фэрмы зусім слаба ўкамплектаваны: толькі адна фэрма налічвае стада трусоў у 577 галоў, а ў іншых па галоўе трусоў вельмі нязначнае. Гэта паказвае на тое, што ў справе калгаснай трусагадоўлі дагэтуль яшчэ існуе апартуністычная недаацэнка. Згодна плянавых заданьняў у гэтым годзе трусагадоўчыя таварныя фэрмы павінны быць укамплектаваны 60 тысячамі трусоў.

Нават і ў тых калгасах, дзе не арганізуюцца таварныя фэрмы таксама неабходна зьвярнуць вялікую ўвагу па пытаньні разьвіцьця трусагадоўлі, шляхам калектыўнай гадоўлі.

Надзвычай карысна арганізаваць разьвядзеньне трусоў пры фабрыках, заводах, сталоўках і школах. Асобныя рабочыя, калгасьнікі і калгасьніцы могуць у індывідуальным парадку заняцца разьвядзеньнем трусоў. Гэтым самым яны агульнымі сіламі і паасобку будуць дапамагаць хутчэйшаму вырашэньню мясной праблемы.

К-ў.

Трусагадоўля—не забава, а важнейшая дадатковая крыніца рабочага забесьпячэньня. Кожная прыгарадная гаспадарка, рабочая сталовая, больніца і школа, кожная рабочая сям'я павінна мець свой трусатнік.

17163/XII

Барацьба з хваробамі і шкоднікамі расьлін— барацьба за высокі ўраджай

Сельская гаспадарка СССР траціць штогод мільярды рублёў ад розных хвароб расьлін і ад шкоднікаў. Так паводле матар'ялаў саюзнага Наркамзему, ад недастатковай барацьбы з галаўнёй (сажай) разьмер страт па СССР дасягае 172 мільёнаў руб. у год; ад недастатковай барацьбы з азімай соўкай (начнік)—62 мільёнаў руб., ад недастатковай барацьбы з лугавым матылём—150 мільёнаў руб., ад сусьлікаў і мышэй і г. д.—900 мільёнаў руб.

Барацьба з хваробамі і шкоднікамі сельскагаспадарчых расьлін зьяўляецца адным з галоўнейшых мерапрыемстваў у справе дасягненьня высокага і ўстойлівага ўраджаю. „Таму выцягнем гэту справу з канцылярый, установ і габінэтаў вучоных, каб упрэчы ў яе вучоных і ўстановы і, што важней за ўсё—сілы саміх калгасьнікаў". Так сказаў тав. Якаўлеў (Нарком Земляробства СССР).

З прычыны слабай барацьбы з пустазельлем краіна саветаў штогод недабірае дзесяткі мільёнаў тон збожжа, аўса і г. д. Калі не змагацца з пустазельлем, яно можа эусім зьнішчыць ураджай. Барацьба з пустазельлем—барацьба за калгасны ўраджай. Абкашваньне дарог, канаў і г. д. да пачатку квітненьня пустазельных расьлін, праполваньне пасеву, апрацоўка міжрадзьдзяў абсыпных культур (абсыпка, матыкаваньне), баранаваньне і пераворваньне папару, сваячасовая ўборка ўраджаю, узьняцьце занятага папару і безадкладнае ворыва або лушчэньне поля пасьля ўборкі ўраджаю (пажніўнае лушчэньне іржышча, ворыва на зяблёва і г. д.)—вось рад практычных мерапрыемстваў, якія павінны быць праведзены кожным саўгасам і калгасам, які па сапраўднаму будзе змагацца за ўраджай. Ня трэба забываць, што многія сьмяцьцёвыя расьліны зьяўляюцца гнёздамі шкоднікаў сельскай гаспадаркі.

Кожны калгасьнік і калгасьніца павінны памятаць, што рубель, страчаны на барацьбу з галаўнёй, выратоўвае на 6 руб. зерня, кожны рубель, страчаны на барацьбу з азімай соўкай, выратоўвае на 15 руб. ураджаю, а рубель, затрачаны на барацьбу са шкоднікамі садоў, выратоўвае ўраджай саду на 137 руб.

Адным з сур'ёзьнейшых шкоднікаў ярыны і азіміны ў БССР зьяўляецца швэцкая муха, а з хвароб—галаўня.

Са шкоднікаў саду трэба адзначыць самага сур'ёзнага шкодніка яблынь—яблыневую лістаскочку, або мядзяніцу і яблыневую траўніцу (самы галоўны шкоднік садоўніцтва). Паражэньне траўніцай вельмі моцнае, не пасьпеюць яшчэ распусьціцца пучкі, як яны ўжо акружаны з усіх бакоў траўніцамі. Яблыневы кветкажор—належыць да самых звычайных шкоднікаў нашых садоў і дае надта вялікі процант пашкоджаньняў. У іншыя гады бывае вельмі вялікая шкода садам ад дарослых жукоў—хрушчоў.

Са шкоднікаў гароду звычайнымі зьяўляюцца—капустная траўніца, капусьніца і капустная моль (адзін з самых сур'ёзных шкоднікаў гароду), а таксама блохі—гэтыя звычайныя і моцныя шкоднікі рассады.

Швэцкая муха вельмі дробны шкоднік і мала прыкметны. Шкоду прыносяць лічынкі мухі, якія перазімоўваюць на азімых усходах. Увесну лічынка мухі зварачаецца ў ляльку, з якой праз некалькі дзён вылятае муха. Гэтыя мухі ляцяць на маладыя ўсходы ярыны і на іх адкладваюць свае яйкі. Лічынка, якая праз некалькі дзён выходзіць з яек, пранікае ў сярэдзіну сьцябла, перагрызае сярэдні ліст, які потым сохне, а за ім гіне ўся расьліна.

У тыя гады, калі яравыя моцна паражаюцца швэцкай мухай, трэба рабіць некалькі пазьней пасевы азімых. Яравыя трэба высяваць як мага раней таму, што пасевы раньніх тэрмінаў лепш захоўваюцца. Паколькі швэцкая мушка ў значнай колькасьці кладзе свае яйкі ва ўсходы, падаліцы і ў сьцераку знаходзіцца вялікая колькасьць каконаў швэцкай мушкі, таксама як і іншых шкоднікаў—вельмі карысна рабіць заворваньне сьцераку зараз жа пасьля ўборкі ўраджаю глебы. Калі-ж гэта немагчыма, трэба неадкладна пасьля ўборкі рабіць лушчэньне сьцераку, а пазьней увосень абавязкова рабіць зяблёва.

Галаўня хвароба, якая пашкаджае каласы, мяцёлкі і сьцяблы збожжа, зварачае іх у чорны пыл (сажу). Гэтая хвароба значна зьніжае ўраджай усяго нашага збожжа—жыта, аўса, ячменю, пшаніцы і проса. На жыце бывае ванючая і сьцеблавая галаўня, таксама і на пшаніцы. На ячмені бывае лятучая і цьвёрдая галаўня. На аўсе і просе галаўня пашкаджае мяцёлкі. Галаўня зьмяншае ўраджай збожжа, а таксама псуе пасеўнае зерне.

Каб зьнішчыць галаўню трэба рабіць пратручваньне насеньня. Апрача пратручваньня ў справе барацьбы з галаўнёй значную ролю адыгрываюць наступныя мерапрыемствы; пасеў чыстагатунковым насеньнем, правільна выбраныя тэрміны сяўбы, правільны севазварот, угнаеньні, правільны абмалот і хаваньне пасеўнага матар'ялу.

Аб шкодніках садоў і гародаў і мерах барацьбы з імі будзе зьмешчана падрабязна ў наступным нумары часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі".

К-ў.

846

З ФРОНТУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Уступіў у строй завод рэжучых інструмантаў

Першы ў СССР завод рэжучых інструмантаў „Фрэзэр" імя М. І. Калініна ўступіў у строй.

Па-ўдарнаму за 14 месяцаў пад Масквой вырас завод, які пры поўнай магутнасьці дасьць 17 млн. найскладанейшых фрэзэраў, грабёнак, разьвёртак, мэтчыкаў і інш., вызваліць СССР ад імпарту рэжучых інструмантаў. Па тэхнічным абсталяваньні і разьмерах завод апярэдзіў лепшыя ў сьвеце інструмантальныя заводы.

Сусьветны гігант электразваркі

Новы электразварачны корпус заводу „Электрык" 30-га красавіка быў пушчан на поўную магутнасьць. У гэтым годзе корпус выпусьціць 10.000 зварачных апаратаў і машын. Гэта найвялікшы ў сьвеце завод па вырабе зварачных апаратаў. Новы корпус заводу выпусьціць у гэтым годзе зварачных машын больш чым усе фірмы сьвету разам узятыя.

144 у дзень

Сталінградзкі трактарны завод асвоіў праектную магутнасьць і выпускае 144 трактары ў дзень.

СТЗ пакідае далёка ззаду такія сусьветныя заводы, як Форда, Мак Корміна, Катэрпілера, якія задыхаюцца ад крызісу. 144 у дзень – гэта не апошняе слова сталінградцаў, яны выступаюць у перадавых радох байцоў за сацыялістычныя тэмпы.

Пушчана Макееўская домна

15 красавіка пушчана Макееўская домна. Гэта адна з тых домнаў, якія ператвараюць Макееўскі завод у буйнейшае ў СССР прадпрыемства, што будзе выпускаць звыш 2.100 тон чыгуну ў суткі. Раней завод выпускаў 230 тысяч тон чыгуну ў год.

* * *

У глушы Уральскай тайгі за два гады вырас першы магутны гігант савецкай хэміі.

Калектыў камбінату сустрэў 1 мая ўводам у строй сацыялістычнай індустрыі магутнага хэмічнага прадпрыемства. У склад камбінату ўваходзіць: першы ў СССР завод сынтэтычнага аміяку, заводы серкавай кіслаты, магутная цеплаэлектрацэнтраль, буйнейшая воданасосная станцыя і дапаможныя прадпрыемствы. 23 красавіка атрыман першы аміяк. 24-га красавіка атрыманы першыя вагоны азотных угнаеньняў.

Гэта вялізарнейшая перамога сьведчыць яшчэ раз аб рэальнасьці нашай праграмы тэмпаў, аб правільнасьці генэральнай лініі партыі.



Пераліўка чугуна ў коўш. (Завод імя Дзяржынскага ў Запарожжы)

ЗДАВАЙЦЕ

ПАДПІСНУ НА ЧАСОПІСЬ

РАБОТНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА БЕЛАРУСІ

ЛІСТАНОСЦАМ АБО НА ПОШТУ

ЧАСОПІСЬ ВЫХОДЗІЦЬ 3 РАЗЫ Ў МЕСЯЦ

КАШТУЕ 20 КАП.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, САВЕЦКАЯ 63, 3-І ПАВЕРХ, ПАКОЙ № 11.

Выданьне ЦК КП б)Б

Час. вык. абав. рэдактара В. БУЛКО.

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 1135. 17.200 экз. Уп. Галоўлітбелу № А—4.